# МАЛОЧНЫЯ ВЕДЗЬМЫ
# ВА ЎЯЎЛЕННЯХ БЕЛАРУСАЎ І ЧЭХАЎ

**Г. В. Лахоўская**

Малочныя ведзьмы (ведзьмы-малочніцы, ведзьмы-кароўніцы) – згодна з міфалагічным слоўнікам, «міфічныя істоты, шкоднасць якіх палягае ў адбіранні ім у кароў малака, ад чаго змяншаўся ўдой, яно рабілася вадкае, без вяршкоў, тым часам як у кароў саміх ведзьмаў малако станавілася надзвычай густое і адразу збівалася ў масла» [1, с. 37]. Менавіта з-за «спецыфікі» сваёй магіі ўяўленні пра малочных ведзьмаў былі шырока распаўсюджаныя ва ўсіх народаў, якія займаліся гадаваннем кароў. У дадзенай працы будзе прадстаўлены кампаратывістычны аналіз уяўленняў аб ведзьме-малочніцы ў беларусаў і чэхаў.

Нягледзячы на тое, што Беларусь не мае блізкага суседства з Чэхіяй, нашыя міфалагічныя сістэмы маюць шмат агульнага. Гэта добра ілюструюць уяўленні, прымхі і забабоны, звязаныя менавіта з сельскагаспадарчай сферай і канкрэтна абраным намі персанажам – ведзьмай-малочніцай, ці, як яе называюць на усходзе Чэхіі, басоркай, чарадзейніцай (чэш. дыял. bosorka, čarodějnica).

Уражвае тое, наколькі аднолькава ўспрымаюць праявы бытавой магіі розныя народы. І беларусы, і чэхі ўчыненае ведзьмамі-малочніцамі зло апісваюць адным і тым жа дзеясловам: беларускае «каровам удзеяно» і чэшскае «dobytku urobeno» (літаральна «статку зроблена»). Супадае і ўяўленне пра самую постаць таго, хто гэтае зло зрабіў: гэта абавязкова жанчына-аднасяльчанка, якая нічым не вылучаецца ад астатніх, аднак мае «малую і сухую кароўку» [3, с. 17] – і тая дае надзіва шмат густога ўдою. Менавіта на такую жанчыну найперш і падае падазрэнне, калі ў кагосьці з вёскі ў дойнай каровы прападае малако ці цячэ малако з крывёю: «Калі карова захварэе ці не дае малака або яе малако бывае з кроўю ці абарачаецца ў жур, адразу аткіпае, та гаворадь, што хтось карову зачараваў, і стараюцца знайсці такіх людзей, каторыя маглі б тое атрабіць» [2, с. 418]. У дадзеным выпадку пад такімі людзьмі маецца на ўвазе знахарка ці проста больш моцны чараўнік; у Чэхіі такіх людзей называюць «bohyně» і вельмі часта звяртаюцца па іх дапамогу.

Пад малочнымі ведзьмамі таксама падазравалі асобных тутэйшых жанчын, здольных ажыццяўляць чарадзейскія дзеянні не толькі ў сваім натуральным абліччы (на ліхі промысел яны выходзілі голымі ці ў кашулі, з раскудлачанай галавой), але і ператвораных ў нейкую зааморфную істоту: жабу-рапуху, сабаку, кошку, ласку, курыцу, гругана, лелякa (казадоя), гадзюку, яшчарку, муху. Шкода, учыненая такой жывёле, пераносіцца і на ведзьму, таму яе потым лёгка пазнаць:

«…ведзьма скінуласа жабаю да й скачэ к варотам. Дагадаўса тут Сымон, якая гэто жаба, да давай яе прыпякаць грамнічнай свечкаю: трымае за лапу да смаліць агнём, ажно сала сквярэцца. Круціласа-круціласа ведзьма да й выкруціла сабе ногу. Здаволіўса Сымон да й выкінуў жабу вон чуць жывую. Назаўтра бачаць людзі, аж паганая маскоўка ляжыць з вывіхнутаю нагою, а чэраво ў яе асмалено, бы перад Калядамі свіння. Хаць маскоўка й казала, што яна стаяла перад печ'ю й што на ёй загарэлася сарочка, але таму ніхто не верыць, бо гэта толькі атгаворкі паганае ведзьмы» [2, с. 414]. Угледжаную ў хляве вялікую жабу ці не сваю кошку тройчы білі крыж-накрыж лазовым прутом як пераўвасобленую кароўніцу і выгуквалі яе імя. Падазронай жабе наносілі раны, спадзеючыся, што адпаведнае калецтва праявіцца і на сапраўднай ведзьме або наагул праколвалі яе асінавым калом. У пакаранні ведзьмы-малочніцы таксама прымянялася імітатыўная магія: у толькі што падоенае малако ўкідвалі напаленую да чырвані падкову, і сэрца шкодніцы абавязкова заскварыцца. Гэтаксама прынятую за вядзьмарку муху завязвалі ў цадзілку, калолі іголкамі і вешалі ў анучцы пад загнетам, распаліўшы агонь асінавымі дровамі і крапівою, каб дакладна так пякло і калола ліхадзейцы. За суткі такіх выпрабаванняў, казалі, вядзьмарку можна давесці да смерці. Калі ж яна ўсё-такі прыбяжыць прасіць літасьці, трэба пільнаваць, каб, адыходзячы, не знесла з двара шчопаць зямлі ці якую трэску, бо ўсе свае чары паўторыць ізноў [1, с. 38].

У чэшскай жа традыцыі звестак пра зааморфнае аблічча ведзьмы мы не знаходзім, але прынцып бескантактнага ўздзеяння захоўваецца: каб нашкодзіць ведзьме і правучыць яе, трэба пэўным чынам фізічна ўздзейнічаць на малако: «У адной гаспадыні на Гразенкове вельмі блага даіліся каровы. Яна пайшла да знахаркі і тая ёй параіла, каб наліла малако ў ночвы і біла яго пруцікамі з шыпамі, пакуль яно ўсё не шчэзне. Але трэ было зачыніцца ў хаце і нікога не пускаць. Як тая гаспадыня пачала ўзбіваць і біла моцна, прыбегла да яе суседка і крычала ёй, каб перастала, але тая яшчэ больш пачала біць, аж пакуль ночвы не сталі сухія. З таго часу каровы даіліся добра, а ведзьма потым ляжала ўся збітая і паколатая» [3, с. 14]. Заўважаным у вядзьмарстве асобам стараліся нічога не даваць, каб праз пазычаную рэч не адабралі малака.

Таксама, напрыклад, поўнасцю супадаюць спосабы, якімі вядзьмаркі карысталіся для адбірання малака. Так, самы папулярны з іх – збіранне расы з палеткаў з дапамогай ручніка ці посцілкі, з якіх потым і будзе бегчы скрадзенае малако. Аб такім спосабе сведчаць усе інфарманты: «Але ось пашла па сялу пачутка, што тая маскоўка стала ведзьмаю. Та той, та сёй пачалі расказваць, што бачылі, як маскоўка на вешняга Юр'я

прасцілала па расе рушнік да збірала росу ў дайніцу, каб цягнуць к сабе малако з тых кароў, якія пройдуць па том мейсцы» [2, с. 412]; «Кожны дзень перад выхадам сонца яна хадзіла па палях і лугавінах і збірала расу ў посцілку, якую потым вешала на балку ў пуні і з яе кутасоў выдойвала малако» [3, с. 13]. Як бачым, беларускія вядзьмаркі не проста збіралі ранішнюю расу – яны скарыстоўвалі юр'еўскую расу («раса малочная»), якая ва ўяўленнях народа валодала магічнымі і гаючымі ўласцівасцямі: «На Юр'я чараўнікі да ведзьмы раненько да сонейка голыя выходзяць на поле й там прасцілаюць рушнікі да й збіраюць расу. От тая раса й дае ім сілу цягнуць сабе ат кароў малако» [2, с. 418]. Пры цяганні ручніка вядзьмаркі прамаўлялі розныя магічныя словы: «Няхай з вады малако будзе»; «Малако з кветак чырвоных, жоўтых, белых…плыві да нас!»; «Кароўкі ўсялякае масці, няхай ваша малако да мяне ідзе!». Цягаючы анучку, па мянушках пералічвалі ўсіх кароў, і таму гаспадыні давалі каровам падменныя мянушкі, адпаведныя дням іх нараджэння (Васкрасёха, Панедзя, Аўтурэня, Сярода, Чацвера, Пяцёха, Субоня), або мянушкі свінні, кошкі , сабакі і г.д., у выніку чаго ведзьма атрымае ці малако, ці мачу ад гэтых жывёлаў [1, с. 38].

Існавалі і іншыя спосабы здабычы малака. Адабраць малако ў каровы ведзьма-кароўніца магла нават толькі глянуўшы на яе вымя ці пакаштаваўшы яе малака, а таксама ўзяўшы касмыль яе поўсці, пусціўшы сваю карову ў агульную чараду, пазбіраўшы раскіданыя пастухамі крошкі (ва ўсіх выпадках-праява кантактнай магіі), альбо «доячы» зубы бараны (імітацыйная магія) з думкамі пра пэўных кароў. Ведзьма-малочніца магла таксама перакінуцца ў дробную жывеліну, прычапіцца да вымя і высмоктвала малако, ад чаго карова шалела і захворвала на мастыт [1, с. 38].

Аднак беларускія ведзьмы-малочніцы ўсё ж мелі некаторыя адрозненні ад сваіх заходнеславянскіх сяброўак. Час разгула ведзьмаў ва ўяўленні беларусаў не абмяжоўваўся толькі Юр'ем: яны былі вельмі актыўнымі таксама і на Купалле [1, с. 37]. На купальскую ноч ведзьмы-малочніцы і чэрці збіраліся разам і ладзілі агульнае купанне ў малацэ, адабраным у чужых кароў: «На Купало ведзьмы ездзяць на каровах і прыязджаюць з пашы аж да ваколіцы» [2, с. 420].

Ад шкоднага ўздзеяння малочнай ведзьмы існавала цэлая сістэма абярэгаў: на шыю карове вешалі свечкі, часнык, асвечаную соль, а на рогі – вянкі з папараці і з асінавых галінак; першацёлам у рагу свідравалі дзірачку і, заліўшы туды ртуць, залеплівалі воскам ад грамнічнай свечкі; пры запасванні, каб усе чары аказаліся марныя, праціралі вымя асвечаным макам, змазвалі асвечаным салам, клалі на Юр'я ў варотах жалеза, ніты ад кроснаў («Як гадзюка нітоў не разбярэ,

так ад кароўкі малака не адбярэ. Як жалеза гадзюка не ўгрызе, так каб ведзьма маю кароўку не згрызанула»); гаспадары падкурвалі кароў асвечанымі зёлкамі; давалі з'есці карове стоўчаную высушаную змяю, знойдзеную напярэдадні Юр'я; пакрывалі карову кажухом; абсявалі абору крапівою, макам; вешалі на вароты хлява калючыя, пякучыя і з горкім пахам расліны, грамнічныя свечкі, на якіх, казалі, застаюцца сляды зубоў вядзьмаркі, якая так і не здолела прабрацца ў хлеў; на Вадохрышча рабілі крыж, апускалі яго ў калодзеж, а дастаўшы, прымацоўвалі на варотах; праганялі карову праз распалены на вуліцы агонь, які мусіў знішчыць чары [1, с. 38]. У чэшскай традыцыі таксама было прынята выкарыстоўваць атрыбуты, якія застаюцца пасля вялікіх святаў (тыя ж свечкі, ваду, свянцонае дрэва).

Такім чынам, мы бачым шмат агульнага ў прымхах і забабонах, якія тычацца побытавай магіі беларусаў і чэхаў. Уяўленні пра самую асобу ведзьмы, спосабы адбірання малака, бесконтактнае ўздзеянне – усё знайшло адлюстраванне ў вераваннях нашых народаў.

**Літаратура**


1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. 2-ое выданне, дапоўненае. Мінск: Беларусь, 2006.
2. *Сержпутоўскі А.К.* Русальная нядзеля. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; склад., уступ. арт., пасляслоўе, навук. рэд., літ. апрац. У.К. Касько. Мінск: Выш. шк., 2009.
3. *Bedřich Rychlík*. Pověsti z Moravských Kopanic. Brno: 2001.


## АГУЛЬНАСЛАВЯНСКІЯ ПРОЗВІШЧНЫЯ ТЫПЫ НА ТЭРЫТОРЫІ РАМЕЛЬСКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТА СТОЛІНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ


**В. В. Лемяза**


Акадэмік М. В. Бірыла, даследуючы структуру антрапонімаў, прапанаваў усе прозвішчы падзяліць на першасныя і другасныя, што дапаможа паказаць асаблівасці словаўтваральнай структуры антрапонімаў [1]. Прычым падчас вывучэння другасных прозвішчаў, марфалагічная структура якіх з'яўляецца сукупнасцю прозвішчнай асновы і прозвішчнага фарманта, вучоны засяродзіў увагу на мэтазгоднасці даследавання ў складзе славянскіх антрапонімаў агульнаславянскіх, усходнеславянскіх і ўнутрымоўных прозвішчных тыпаў [3].

Даследаванне прозвішчаў жыхароў Рамельскага сельскага савета Столінскага раёна (фактычны матэрыял налічвае 312 антрапонімаў) паказала, што найбольшай колькасцю адзінак вызначаецца група